3 (200)
**сакавік**

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

*Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1221 ад 14 студзеня 2013 г.*

Выходзіць 12 разоў у год (з ліпеня 2003 г.)

НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС

**Заснавальнікі:**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Пачатковая школа", дзяржаўная навуковая ўстанова "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

**Рэдакцыйная калегія:**

Галоўны рэдактар Максім Навумавіч Гальпяровіч

Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў ЧаснОўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.

**Рэдакцыйная рада:**

Уладзімір Адамушка, Юрый Бохан (старшыня рады), Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Аляксандр Корзюк, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыпанок, Анатоль Шаркоў.

**Рэдакцыя:**

Намеснік галоўнага рэдактара — Наталля Матусевіч, рэдактар аддзела — Надзея Кушнер, мастацкае афармленне — Уладзімір Малахаў, вёрстка — Надзея Пяткоўская, карэктура — Людміла Шчэрба.

**ЗМЕСТ**

**Слова ад рэдакцыі** 3

**ПАЛІТЫЧНАЯ ГІСТОРЫЯ**

Рыгор Лазько — **Самавызначэнне, прыпыненае гвалтам** *(Да пытання аб разгоне Усебеларускага з'езда 1917 года)* 5

**ГІСТАРЫЯГРАФІЯ**

Валянцін Голубеў — **Найноўшая беларуская гістарыяграфія гісторыі Вялікага Княства Літоўскага (канец XX — пачатак XXI ст.): дасягненні, задачы, перспектывы** 13

**ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ**

Юрый Бохан — **Плебейская зброя і зброя ў руках плебеяў у ВКЛ у XV—XVI стст.** 20

# Вучоны. Педагог. Арганізатар гістарычнай навукі

## *(да 70-гадовага юбілею Аляксандра Аляксандравіча Кавалені)*

*У сакавіку 2016-га года спаўняецца 70 гадоў акадэміку-сакратару Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў, члену-карэспандэнту Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктару гістарычных навук, прафесару Аляксандру Аляксандравічу Каваленю.*

Аляксандр Кавалення нарадзіўся 14 сакавіка 1946 г. у гарадскім пасёлку Капыль (цяпер горад Мінскай вобласці). Яго бацька Аляксандр Емяльянавіч працаваў дырэктарам, настаўнікам вясковай школы, маці — Ганна Аляксандраўна прысвяціла жыццё выхаванню шасці дзяцей, якіх трэба было ў пасляваенныя нішчымныя гады падымаць ды выводзіць у людзі.

Верагодна, размовы з бацькамі аб "партызанцы" вызначылі навуковыя інтарэсы Аляксандра Аляксандравіча — ваенная гісторыя Беларусі. Аляксандр Емяльянавіч у гады Вялікай Айчыннай вайны быў партызанам, а Ганна Аляксандраўна — сувязной партызанскага атрада. Аднак шлях да навуковых вышынь быў няпросты і патрабаваў дзесяцігоддзяў цяжкай паўсядзённай і ўпартай працы.

Пасля заканчэння дзевяці класаў школы Аляксандр Кавалення ў 1962 г. паступіў у Мінскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 23, якое закончыў на выдатна ў 1964 г., атрымаўшы спецыяльнасць слесара. Пасля заканчэння вучылішча працаваў на будоўлях Мінска. У 1965 г. яго прызвалі ў Савецкую армію. Служба ў дэсантных войсках давалася лёгка, бо ён меў выдатную фізічную падрыхтоўку, арганізатарскія і камандзірскія здольнасці. У 1968 г. А.Кавалення быў дэмабілізаваны ў званні старшага сяржанта.

Пасля войска паступіць у ВНУ не атрымалася і давялося зноў працаваць на будоўлях Мінска. Але мара пра вышэйшую адукацыю ніколі не пакідала Аляксандра. Яна здзейснілася ў 1970 г., калі ён паступіў на гісторыка-геаграфічны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М.Горкага (закончыў у 1975 г.). Менавіта ў педінстытуце Аляксандр Кавалення сфарміраваўся як педагог, вучоны, арганізатар навукі. Вучобу студэнт А.Кавалення спалучаў з грамадскай працай, працаваў у студэнцкіх будаўнічых атрадах у Карэліі, Сібіры, Беларусі. Арганізатарскі волыт, уменне працаваць з людзьмі былі заўважаны кіраўніцтвам педінстытута імя А.М.Горкага. Яго не раз выбіралі старшынёй прафсаюзнага бюро факультэта, а з 1974 па 1979 г. ён узначальваў студэнцкі прафсаюзны камітэт інстытута.

Прага да навуковых даследаванняў лагічна прывяла Аляксандра Каваленю ў 1979 г. у аспірантуру інстытута — на кафедру гісторыі КПСС. Таленавітага аспіранта заўважыў доктар гістарычных навук, прафесар Аляксандр Мікалаевіч Мацко. Пад яго кіраўніцтвам у 1983 г. А.А.Кавалення паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю "Идейно-политическая работа подпольных партийных организаций КП(б)Б в партизанских зонах". Менавіта з гэтай тэмы пачалося і працягваецца да цяперашняга часу вывучэнне ім гісторыі партызанскага руху ў Беларусі, а ў больш шырокім кантэксце — гісторыі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Глыбіня і шырыня поглядаў на падзеі вайны спрыялі таму, што з 1983 г. па 1991 г. Аляксандр Аляксандравіч з'яўляўся членам Рэспубліканскага каардынацыйнага савета па распрацоўцы праблем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, удзельнічаў у распрацоўцы дзяржаўных праграм фундаментальных даследаванняў нацыянальнай гісторыі па заданнях "Акупацыйны рэжым на Беларусі ў ваенныя гады: гісторыка-параўнальны аналіз (1915—1921 гг., 1941—1944 гг.)", "Беларусь у гады Другой сусветнай вайны", — а таксама ў падрыхтоўцы калектыўнай працы "Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: пытанні гістарыяграфіі і крыніцазнаўства" (Мн., 1999). Навуковая праца не перашкаджала і педагагічнай дзейнасці. А.Кавалення з 1982 г. пачаў працаваць асістэнтам кафедры гісторыі КПСС педінстытута, потым старшым выкладчыкам, а ў маі 1987 г. стаў дацэнтам гэтай жа кафедры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У 1995 г. Аляксандр Каваленя паступіў у дактарантуру БДПУ імя Максіма Танка, але ўжо ў наступным годзе яго адклікаюць з дактарантуры і абіраюць загадчыкам кафедры айчыннай і сусветнай гісторыі ўніверсітэта. Перад новым загадчыкам кафедры стаяла задача не толькі вызначыць навукова-метадычны напрамак дзейнасці кафедры, але і галоўнае — захаваць калектыў. У гэтыя гады найбольш яскрава і праявіліся яго арганізатарскія здольнасці і бачанне перспектыў развіцця кафедры. Фактычна кафедру ўзначаліў антыкрызісны менеджар. Пад кіраўніцтвам А.А.Кавалені была распрацавана канцэпцыя гістарычнай адукацыі студэнтаў негістарычных спецыяльнасцяў, падрыхтавана праграма курса "Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай цывілізацыі". Кафедра стала адным з цэнтраў вывучэння гісторыі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

У гэты час выходзіць манаграфія А.А.Кавалені "Беларусь у гады Другой сусветнай вайны (1939—1945)" (Мн., 1996), адзначаная прэміяй і дыпломам лаўрэата конкурсу БДПУ імя Максіма Танка за 1997 г. У 1999 г. выйшла чарговая яго манаграфія "Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі. 1941—1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць" (Мн., 1999). Менавіта па гэтай тэме Аляксандр Каваленя ў 2000 г. абараніў доктарскую дысертацыю.

Аляксандр Аляксандравіч шмат увагі надае ўдасканаленню педагагічнай гістарычнай адукацыі вучняў і студэнтаў негістарычных спецыяльнасцяў. Відавочным сведчаннем гэтага з'яўляецца падрыхтаваны пад яго кіраўніцтвам і пры непасрэдным аўтарскім удзеле вучэбна-метадычны комплекс "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны), які прынёс яму шырокую вядомасць, быў станоўча ацэнены і ўспрыняты ў навукова-педагагічных колах, настаўнікамі, ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, шырокімі коламі грамадскасці Беларусі. Аб яго вартасці сведчыць той факт, што педагагічная грамадскасць СНД прызнала яго лепшым у краінах СНД.

Працаздольнасць, ініцыятыва, арганізатарскі талент А.А.Кавалені не засталіся без увагі. У кастрычніку 2004 г. яму прапаноўваюць узначаліць Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ён узначальвае акадэмічны інстытут, які на той момант па многіх пазіцыях страціў сваё значэнне і аўтарытэт сярод навуковай грамадскасці, і выводзіць яго ў лідары гістарычнай навукі нашай краіны.

Час дырэктарства Аляксандра Аляксандравіча ў Інстытуце гісторыі (2004—2010 гг.) яшчэ раз ясна паказаў яго арганізацыйныя здольнасці. Дзякуючы яго ўмеламу кіраўніцтву Інстытут гісторыі ператварыўся ў дзяржаўны цэнтр арганізацыі сістэмных гістарычных даследаванняў; вучоныя інстытута паспяхова выканалі Дзяржаўную комплексную праграму навуковых даследаванняў на 2006—2010 гг. "Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры"; 1 лістапада 2007 г. у інстытуце была адкрыта ўнікальная Археалагічная навукова-музейная экспазіцыя; вучонымі



*Аляксандр Аляксандравіч Каваленя падчас рабочай сустрэчы.* Фота 2015 г.

інстытута былі падрыхтаваныя і рэалізаваныя на практыцы навуковыя канцэпцыі абноўленага Музея гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Музея Нацыянальнага парку "Белавежская пушча", а таксама распрацавана навуковая канцэпцыя Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.

Нягледзячы на напружаную адміністрацыйную, навуковую працу, Аляксандр Аляксандравіч ніколі не забывае, што ён педагог і, магчыма, як ніхто іншы асэнсоўвае важнасць ваенна-патрыятычнага выхавання маладога пакалення на прыкладах з ваеннай гісторыі Беларусі. Ужо 9 гадоў Аляксандр Аляксандравіч узначальвае аргкамітэт Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі вучняў "Вялікая Айчынная вайна 1941—1945 гадоў у гістарычнай памяці народа", якая штогод праводзіцца на базе гімназіі № 174 Мінска. Канферэнцыя набыла шырокую вядомасць, у яе працы прымаюць удзел вучні не толькі з усёй Беларусі, але і з іншых краін СНД.

У 2009 г. у жыцці А.А.Кавалені як арганізатара навукі адбыўся новы паварот. Яго ўмелае кіраўніцтва Інстытутам гісторыі, нястомная праца па папулярызацыі гістарычных ведаў былі заўважаныя на высокім дзяржаўным узроўні. 29 студзеня 2009 г. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ён быў уключаны ў склад Прэзідыума НАНБ. 5 лютага 2009 г. ён прызначаецца акадэмікам-сакратаром Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАНБ. Восенню 2010 г. ён пераходзіць на пастаянную працу ў прэзідыум, каб засяродзіцца на навукова-арганізацыйных пытаннях развіцця гуманітарных навук і мастацтваў, дзе працуе і па сённяшні час. Высокая навуковая кваліфікацыя і арганізатарскія здольнасці былі адзначаныя і акадэмічнай супольнасцю. У 2014 г. А.Каваленю абіраюць членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Адміністрацыйная праца займала і займае шмат часу ў Аляксандра Аляксандравіча, але ён заўсёды знаходзіць яго і для навуковых даследаванняў. Ім апублікаваныя больш за 400 навуковых і вучэбна-ме-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




*Падчас адкрыцця Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і заканчэння Другой сусветнай вайны.*
Злева направа: міністр абароны Рэспублікі Беларусь Андрэй Аляксеевіч Раўкоў, старшыня Прэзідыума Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі Уладзімір Рыгоравіч Гусакоў, Аляксандр Аляксандравіч Каваленя. Фота 2015 г.

тадычных прац. У тым ліку 4 асабістыя і 20 калектыўных манаграфій, 58 вучэбных дапаможнікаў і праграм. Ён з'яўляецца навуковым рэдактарам і рэцэнзентам звыш 100 манаграфій, навуковых зборнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, дысертацыйных прац. Ім падрыхтаваныя 6 кандыдатаў навук. Ужо 11 гадоў А.А.Каваленя ўзначальвае савет па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі. Аляксандр Аляксандравіч — навуковы рэдактар, член рэдакцыйных калегій і саветаў часопісаў "Доклады Национальной академии наук Беларуси", "Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук", "Архівы і справаводства", "Беларуская думка", "Беларускі гістарычны часопіс", "Гісторыя і грамадазнаўства", "Историческое пространство. Проблемы истории стран СНГ". Ён узначальвае Камісію Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па гісторыі навукі і секцыю "Гуманітарныя і грамадскія навукі" дзяржаўнага экспертнага савета "Сацыяльна-эканамічныя, гуманітарныя і грамадскія навукі" пры Дзяржаўным камітэце па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь, уваходзіць у склад бюро навуковага савета Беларускага фонду фундаментальных даследаванняў.

Плённая праца А.А.Каваленi як вучонага, педагога, арганізатара гістарычнай навукі ацэнена на самым высокім дзяржаўным узроўні. За вялікую арганізатарскую працу ў галіне навукі Аляксандр Аляксандравіч быў стыпендыятам Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у 2002 годзе быў узнагароджаны знакам "Выдатнік адукацыі", у 2006 г. — медалём Францыска Скарыны, у 2009 г. — падзякай Упраўлення справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і ганаровай граматай Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, у 2010 г. — юбілейным медалём "У гонар 80-годдзя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", у 2014 г. — ганаровай граматай Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь. За ўклад ва ўмацаванне адзінства славянскіх народаў у 2004 г. ён абраны сапраўдным членам Міжнароднай славянскай акадэміі адукацыі імя Я.А.Каменскага. За плённую працу па вывучэнні, захаванні і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі 30 декабря 2011 г. А.А.Каваленю абʼяўлена падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 23 чэрвеня 2014 г. Аляксандру Аляксандравічу нададзена званне заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь.

Калектывы гістарычнага факультэта БДПУ імя Максіма Танка, Інстытута гісторыі НАН Беларусі, сябры, калегі і вучні жадаюць Аляксандру Аляксандравічу Каваленю добрага здароўя, далейшых творчых поспехаў у гістарычнай навуцы, навукова-арганізацыйнай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці.

**Аляксандр Касовіч,**
*дэкан гістарычнага факультэта БДПУ імя Максіма Танка, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

**Анатоль Вялікі,**
*загадчык кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ імя Максіма Танка, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.*

***Калектыў рэдакцыі "Беларускага гістарычнага часопіса" далучаецца да віншаванняў і спадзяецца на далейшае плённае супрацоўніцтва з Аляксандрам Аляксандравічам, членам рэдкалегіі і даўнім аўтарам часопіса.***

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ